РАДЗІМА ФОТАЦУДА—ВІЦЕБСК

Часта бачыш людзей з фотаапаратам. І мала хто ведае, што затвор іх фотаапарата быў распрацаваны дзевяноста гадоў назад, у 1878 годзе віцяблянінам Сігізмундам Антонавічам Юркоўскім.

Фотаапарат таго часу быў вельмі складаны і нязручны. Таму многія першыя фотааматары спрабавалі ўдасканаліць яго. Працаваў над гэтым і малавядомы віцебскі фатограф. У 1881—1882 гадах Сігізмунду Антонавічу ўдалося разлічыць і сканструяваць імгненны фатаграфічны затвор. Гэтае вынаходніцтва было першым у свеце. Яго апісанне было апублікавана ў часопісе «Фотограф». Пазней сваё вынаходніцтва Юркоўскі дэманстраваў на маскоўскім з'ездзе фатографаў у 1882 годзе.

«Затвор пры пласцінцы», як называў яго сам аўтар, даваў магчымасць адкрываць і закрываць не аб'ектыў, як гэта было раней, а саму пласцінку. Рабілася гэта пры дапамозе спецыяльнай шырмы-засаўкі, прычым, вельмі хутка.

Выдатная вынаходка С. Юркоўскага, аднаго з піянераў фатаграфіі, дала магчымасць здымаць аб'ект у руху.

Атрымаўшы прызнанне сярод калег-фатографаў, Юркоўскі настойліва працягваў пошукі. Яму ўдалося ўдасканаліць сваю вынаходку, якая атрымала ўжо назву шторка-шчылінnага затвора. Тады ў аддзяленні Рускага тэхнічнага таварыства, членам якога быў Юркоўскі, не хацелі прызнаваць яго навінкі: лічылі яе вельмі складанай. І вынаходнік доўга не мог наладзіць вытворчасць затвораў у Расіі.

Еўрапейскія фірмы ахвотна прапанавалі Юркоўскаму свае паслугі, і ён згадзіўся на выпуск затвораў англійскімі фірмамі «Герыз» і «Тарнтон Пікар». Пазней той самы, некалькі зменены затвор выпускала і нямецкая фірма «Герц».

С. Юркоўскі ў свой час вельмі многа фатаграфаваў. Ён быў добра знаёмы з вядомым рускім жывапісцам І. Рэпіным. Калі той у 1892 годзе пасяліўся ў сваім маёнтку Здраўнева пад Віцебскам, фатограф прыехаў да яго. Тады ў мастака гасціў яго блізкі сябар — Аляксандр Уладзіміравіч Жыркевіч. Юркоўскі сфатаграфаваў спачатку мастака аднаго, потым з яго сябрам. Пасля гэтага ён яшчэ хацеў сфатаграфаваць і майстэрню Рэпіна на другім паверсе невялікага доміка. Аднак мастак не дазволіў, мяркуючы, што Юркоўскі хоча сфатаграфаваць яшчэ незакончаную карціну «Ідзі за мною, сатана». Пакрыўджаны фатограф прапанаваў зняць домік Рэпіна. Мастак згадзіўся і папрасіў прыслаць фатаграфіі.

У музеях Віцебска і Мінска шмат работ Юркоўскага — партрэты вядомых людзей, пейзажы Віцебска, яго вуліцы, цэрквы, касцёлы, масты праз Дзвіну.

Імя Сігізмунда Антонавіча Юркоўскага залатымі літарамі ўпісана ў гісторыю сусветнай і айчыннай фатаграфіі.

А. ПАДЛІЦКІ.